БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС





Алена ДУБОВІК

# Дзейнасць прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах Беларусі ў перыяд нэпа

*У 1920-я гады ва ўмовах нэпа ў БССР дзейнічала значная колькасць невялікіх прыватных прадпрыемстваў і устаноў. Прафсаюзы рэспублікі разгарнулі сярод іх рабочых і служачых работу па прыцягненні ў свае шэрагі. Пры гэтым яны, з аднаго боку, прызнавалі неабходнасць існавання прыватных прадпрыемстваў для аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, а з іншага — нярэдка бачылі ў прадпрымальніках толькі эксплуататараў.*

Прафесійныя саюзы ўзніклі на тэрыторыі Беларусі на рубяжы XIX—XX стст. сярод рамесных рабочых. Найбольш значнымі з іх на той момант былі саюзы шчаціншчыкаў і гарбароў. У час рэвалюцыі 1905—1907 гг. сталі ствараццa легальныя прафсаюзы, аднак пасля рэвалюцыі і ў гады Першай сусветнай вайны амаль усе арганізацыі рабочых спынілі сваё існаванне. Ажыўленне прафсаюзнага руху пачалося пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Пры гэтым ён апынуўся расколатым, паколькі прадстаўнікі асноўных палітычных партый мелі розныя меркаванні адносна прынцыпаў фарміравання прафесійных саюзаў. Такое становішча заставалася на працягу 1917—1920 гг.

Пераход у канцы 1920 — пачатку 1921 г. да мірнага гаспадарчага будаўніцтва праходзіў у абстаноўцы значных эканамічных і палітычных цяжкасцяў. Прамысловая вытворчасць Беларусі, тэрыторыя якой на працягу шасці гадоў з'яўлялася арэнай ваенных дзеянняў, скарацілася амаль у пяць разоў. Больш за палову фабрык і заводаў было знішчана, а колькасць рабочых у цэнзавай прамысловасці (фабрыкі і заводы з колькасцю 16 і болей працуючых на прадпрыемстве) на пачатак 1921 г. зменшылася амаль удвая. Значна ўзрасло беспрацоўе[1]. У такіх умовах патрабаваліся рашучыя крокі для выпраўлення сітуацыі ў эканоміцы.

X з'езд РКП(б), які адбыўся ў сакавіку 1921 г., паклаў пачатак мэтанакіраванаму ажыццяўленню новай эканамічнай палітыкі — нэпа. Прадугледжвалася фарміраванне шматукладнай эканомікі для дасягнення мэтаў хуткага аднаўлення народнай гаспадаркі. Змены ў эканамічнай палітыцы былі замацаваныя шэрагам заканадаўчых рашэнняў цэнтральных і мясцовых органаў улады.

Пад уплывам рашэнняў X з'езда РКП(б) праходзіў Першы Усебеларускі з'езд прафсаюзаў (7—13 мая 1921 г.), які закончыў працэс арганізацыйнага афармлення прафсаюзаў рэспублікі. На 1 жніўня 1921 г. прафсаюзы БССР (тэрыторыя якой у той час уключала толькі шэсць паветаў Мінскай губерні) налічвалі 58 160 членаў і аб'ядноўвалі 98,8% рабочых і служачых 5659 дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх прадпрыемстваў і ўстаноў[2]. У краіне дзейнічаў 21 галіновы саюз. Заўважым, што ў той час у прафсаюзах яшчэ захоўвалася ўведзенае ў перыяд ваеннага камунізму абавязковае калектыўнае членства (у прафсаюзы запісвалі ўсіх асобаў наёмнай працы) і коль-



***ДУБОВІК Алена Аляксандраўна.***

*Выкладчык кафедры паліталогіі, сацыялогіі і сацыяльнага кіравання Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук. Нарадзілася ў Мінску. У 2011 г. закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, з 2013 г. аспірантка кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ імя Максіма Танка. Даследуе гісторыю дзейнасці прафсаюзаў Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых публікацый.*

Репозиторий БНТУ

касць членаў у некаторых саюзах перавышала колькасць працуючых.

Адным з пунктаў новай эканамічнай палітыкі быў дазвол на адкрыццё прыватных прадпрыемстваў. Паводле пастановы Усерасійскага Цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК) ад 7 ліпеня 1921 г., прадпрымальнікі мелі права адкрываць прыватныя прадпрыемствы з колькасцю рабочых не больш за 20 чалавек[3]. У новых умовах прафсаюзы краіны звярнулі ўвагу на неабходнасць ахапіць у сваёй дзейнасці рабочых гэтых прадпрыемстваў. Пленум Усерасійскага Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў (УЦСПС) 23 чэрвеня 1921 г. разгледзеў пытанне "Аб умовах арганізацыі працы на прыватных прадпрыемствах" і даручыў аддзелам УЦСПС — арганізацыйнаму, нарміравання працы і эканамічнаму — тэрмінова распрацаваць палажэнне аб ролі фабрычна-заводскіх камітэтаў (фабзаўкамаў) на прыватных прадпрыемствах, аб умовах працы і зарплаты і аб удзеле прафсаюзаў у арганізацыі на прыватнай вытворчасці рабочага кантролю[4]. 15 жніўня 1921 г. пры аддзеле нарміравання працы УЦСПС было створана цэнтральнае Бюро рэгулявання працы на недзяржаўных прадпрыемствах, а ў кастрычніку зацверджана палажэнне аб такіх бюро на лакальным узроўні. Згодна з ім, яны ўтвараліся пры аддзелах нарміравання працы цэнтральных камітэтаў прафсаюзаў і мясцовых прафсаюзных органаў[5]. XI канферэнцыя РКП(б), якая адбылася ў снежні 1921 г., падкрэсліла *"необходимость организации профсоюзами энергичной защиты интересов труда в частных и арендованных предприятиях"*[6].

У БССР гэтыя пытанні знаходзіліся ў цэнтры ўвагі Савета прафсаюзаў Беларусі (Саўпрафбела). У канцы 1921 г. яго аддзел нарміравання працы правёў нараду з прадстаўнікамі аналагічных аддзелаў павятовых прафбюро, на якой быў заслуханы і абмеркаваны даклад загадчыка аддзела, члена Прэзідыума Саўпрафбела В.Нодэля аб прыватных прадпрыемствах. У прыватнасці, адзначалася, што, паколькі ў бліжэйшы час у Беларусі з'явяцца прыватныя прадпрыемствы, неабходна выпрацаваць прыкладны калектыўны дагавор з прыватнымі прадпрымальнікамі[7]. У 1922 г. да пытання рэгулявання працоўных адносін у недзяржаўным сектары неаднойчы звяртаўся новы аб'яднаны аддзел эканомікі і нарміравання працы Саўпрафбела.

**Характарыстыка прыватнага сектару эканомікі БССР.** На 1 лістапада 1922 г. у БССР на 2930 прыватных прадпрыемствах, зарэгістраваных органамі сацыяльнага страхавання, працавалі 3477 чалавек, або 15% ад усіх занятых рабочых і служачых[8]. Частка дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў была перададзена ў арэнду прадпрымальнікам. У наступныя гады прыватны сектар у БССР павялічваўся. Паводле даных абследавання Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, у 1924 г. у гарадах і мястэчках узбуйненай БССР з агульнай колькасці 10 376 прамысловых прадпрыемстваў 9948 з'яўляліся прыватнымі. Паводле даных на 1 верасня 1924 г., у прыватных асобаў працавалі каля 7300 наёмных рабочых (4600 дарослых мужчын, 400 юнакоў, 2000 дарослых жанчын і 300 дзяўчат)[9]. У 1924/1925 гаспадарчым годзе налічваліся 8233 прыватныя ўласнікі. На прыватных і саматужных прадпрыемствах Беларусі было занята 28,4 тыс. чалавек. Дробная прыватная і саматужная прамысловасць займала значнае месца ў агульным аб'ёме прамысловай прадукцыі рэспублікі. Але ў цэнзавай прамысловасці (на прадпрыемствах з колькасцю 16 і болей працоўных) удзельная вага прыватнага сектара была нязначная: у 1924/25 г. у БССР яна складала 16% ад колькасці дзеючых прадпрыемстваў, толькі 3% ад колькасці занятых рабочых і 4,8% ад валавой прадукцыі[10].

**Формы арганізацыі працоўных прыватных прадпрыемстваў у прафсаюзы.** Прафсаюзная работа на прыватных прадпрыемствах Беларусі набыла больш-менш шырокі характар са студзеня 1922 г. Спачатку яна ўскладнялася адсутнасцю дакладных падлікаў прыватных прадпрыемстваў і працуючых на іх рабочых. Прафсаюзы арганізавалі такі ўлік па спецыяльна складзенай імі анкеце. Таксама для распрацоўкі форм і метадаў вядзення прафсаюзнай работы на прыватных прадпрыемствах пры арганізацыйным аддзеле Саўпрафбела была створана спецыяльная камісія. Яна вызначыла формы прафсаюзнай арганізацыі рабочых прыватных прадпрыемстваў. Іх спецыфіка абумоўлівалася дробнымі памерамі і тэрытарыяльнай раскіданасцю прыватных прадпрыемстваў. Так, пры наяўнасці на прадпрыемстве пяці рабочых выбіраўся дэлегат, які непасрэдна звязваўся з прафсаюзам. Прадпрыемствы з невялікай колькасцю рабочых, размешчаныя блізка адно да аднаго, аб'ядноўваліся для выбараў раённага камітэта прафсаюза (райкама). Рабочыя-адзіночкі (напрыклад, дворнікі), раскіданыя па ўсім горадзе, стваралі пры саюзе адзіны мясцовы камітэт (мясцкам) рабочых прыватных прадпрыемстваў.

Дадзены прынцып быў пакладзены прафсаюзамі БССР за аснову пры арганізацыйнай працы сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў. Так, райкамы былі створаныя пры саюзах гарбароў, харчавікоў, швейнай прамысловасці, аб'яднаныя мясцкамы — у прафсаюзах камунальнай гаспадаркі, дрэваапрацоўшчыкаў, хімікаў. У прафсаюзе народнага харчавання існавала бюро хатніх работніц, і ў кожным раёне Мінска былі выбраны дэлегаты для непасрэднай сувязі з саюзам. У справаздачы Прэзідыума Саўпрафбела ў чэрвені 1923 г. адзначалася, што за год прафсаюзы правялі значную працу па прыцягненні рабочых прыватных прадпрыемстваў. Нямала рабочых прыватных прадпрыемстваў, асабліва ў саюзах гарбароў і швейнай прамысловасці, прымалі актыўны ўдзел у прафсаюзнай рабоце[11].

Формы арганізацыі прафсаюзнай работы на прыватных прадпрыемствах былі канкрэтызаваныя ў рашэннях з'ездаў прафсаюзаў і цыркулярах УЦСПС. На прадпрыемствах з колькасцю працуючых не менш за 50 чалавек (пазней 25) прадугледжвалася стварэнне фабрычна-заводскіх ячэек і выбары для большай сувязі з рабочымі цэхавых упаўнаважаных. Для дробных



Рэпазіторый БНТУ

і блізка размешчаных прадпрыемстваў адной галіны вытворчасці ствараўся аб'яднаны прафсаюзны камітэт (групкам). Ён абіраўся на агульным сходзе рабочых і служачых тэрмінам на шэсць месяцаў. Калі размяшчэнне дробных прыватных прадпрыемстваў не дазваляла арганізаваць групкам прафсаюза, выбіраліся прафупаўнаважаныя.

У справаздачы аб дзейнасці Саўпрафбела за перыяд з ліпеня 1923 г. па люты 1924 г. адзначалася, што агульная колькасць рабочых прыватных прадпрыемстваў складала 5291 чалавек, раскіданых па дробных майстэрнях. Абследаванне фактычнага стану прафсаюзнай работы сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў, праведзенае аргаддзелам Саўпрафбела, паказала, што пераважнай формай арганізацыі з'яўляўся мясцкам прыватных прадпрыемстваў, які знаходзіўся пры праўленні саюза. Аднак ён быў недастаткова гнуткай арганізацыяй у сэнсе поўнага ахопу і абслугоўвання раскіданых па горадзе адзіночак і рабочых, працуючых у дробных саматужных майстэрнях. На нарадзе па выніках абследавання было канстатавана, што найлепшай арганізацыйнай формай прафсаюзнай работы з'яўляюцца раённыя камітэты прыватных прадпрыемстваў, якія ствараліся пры наяўнасці 25 членаў прафсаюза. Першымі іх сфарміравалі прафсаюзы будаўнікоў і харчавікоў[12]. Так, Прэзідыум Цэнтральнага праўлення (ЦП) саюза харчасмакавай прамысловасці БССР 6 верасня 1923 г. разгледзеў пытанне "Аб арганізацыі райкамаў прыватных прадпрыемстваў". На абмеркаванні адзначалася, што раней рабочыя прыватных прадпрыемстваў галіны не былі арганізаваныя ў прафсаюз. Пасля III Усебеларускага з'езда саюза (май 1923 г.) пачалася іх арганізацыя — Мінск падзялілі на 6 раёнаў, у кожным з якіх выбралі ўпаўнаважанага саюза. Далей у дакладзе ўпаўнаважанага 6-га раёна Іцковіча паведамлялася, што з усімі прыватнымі прадпрыемствамі заключаны калектыўныя дагаворы. Разам з тым у мэтах паглыблення прафсаюзнай работы Прэзідыум ЦП прафсаюза палічыў неабходным арганізаваць райкамы саюза замест раённых упаўнаважаных і даручыў правесці гэтае рашэнне з 15 верасня 1923 г.[13]. У студзені 1924 г. Прэзідыум ЦП саюза зноў звярнуўся да пытання аб абслугоўванні рабочых прыватных прадпрыемстваў. Было прынята рашэнне рэарганізаваць чатыры райкамы саюза, якія існавалі на той час, у два з увядзеннем у кожным пасады члена райкама, вызваленага ад іншай працы[14].

У пачатку нэпа ўзнікла пытанне і аб **арганізацыі ў прафсаюзы прыватных служачых**. Прадпрымальнікі не жадалі мець справу з прафсаюзам (гэта патрабавала заключэння калектыўнага дагавора, выплаты страхавых узносаў і г. д.) і, каб пазбавіцца яго апекі, пры прыёме чалавека на работу агаворвалі пад пагрозай звальнення, каб той не ўступаў у прафсаюз. Наёмных служачых пазначалі сваякамі і кампаньёнамі.

На пасяджэннях праўлення прафсаюза савецкіх работнікаў Беларусі 23 мая і 23 жніўня 1922 г. абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі секцыі гандлёвых служачых, але так і засталося нявырашаным. Паступова найбольш актыўныя служачыя пачалі з'яўляцца ў праўленне прафсаюза, і апошняе прыняло меры па выяўленні ўсіх служачых, працуючых на прыватных прадпрыемствах. 11 кастрычніка 1922 г. адбыўся першы арганізацыйны сход прыватных служачых, на якім прысутнічалі 35 чалавек. Пасля дакладаў аб задачах прафсаюза ў галіне аплаты і аховы працы быў выбраны камітэт служачых (камслуж) у складзе 5 чалавек. Дзейнічаў ён дастаткова актыўна — за паўгода было праведзена 7 агульных сходаў, на якіх вырашаліся надзённыя пытанні працы. Калі ў красавіку 1923 г. адбывалася масавае звальненне прыватных служачых (у тым ліку было звольнена 9 членаў прафсаюза), камслуж і праўленне саюза савецкіх работнікаў прынялі непасрэдны ўдзел у іх лёсе — дабіваліся максімальнага памеру "ліквідацыйных" (да двух-трох месячных акладаў), уладкоўвалі звольненых з працы на пасады ў іншыя ўстановы. У канцы мая 1923 г. на прыватных прадпрыемствах і ва ўстановах Мінска працаваў 41 служачы — член прафсаюза[15].

**Пошук шляхоў удасканальвання прафсаюзнай работы ў прыватным сектары.** Улічваючы павелічэнне колькасці прыватных прадпрыемстваў і працуючых на іх, IV Усебеларускі з'езд прафсаюзаў (чэрвень 1924 г.) у рэзалюцыі "Аб задачах арганізацыйнага будаўніцтва" адзначыў, што *"профсоюзы должны усилить работу по вовлечению в союз, обслуживанию и привлечению к практической деятельности союзных органов, рабочих частных предприятий, стремясь провести классовое расслоение между ними и работодателями"*[16]. Для дэталёвага вывучэння форм і метадаў работы прафсаюзаў сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў па рашэнні Прэзідыума Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў Беларусі (ЦСПСБ) у студзені-лютым 1925 г. было праведзена спецыяльнае абследаванне. Камісія арганізацыйнага аддзела ЦСПСБ з удзелам прадстаўнікоў інспекцыі працы і страхавой касы абследавала стан прафсаюзнай работы на 27 прыватных прадпрыемствах Мінска, дзе працавалі 2247 рабочых, 1745 з якіх з'яўляліся членамі 8 прафсаюзаў[17]. У матэрыялах па выніках абследавання адзначалася, што прыватныя прадпрыемствы былі ахопленыя 7 раймясцкамамі саюзаў і яшчэ адзін мясцкам абслугоўваў Бюро хатніх работніц. Таксама было выяўлена, што некаторыя мясцкамы прафсаюзаў (хімікаў, друкароў) аб'ядноўвалі адначасова рабочых прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў, а таксама працкалектывы з беспрацоўных. Зробленая камісіяй выснова, што лепей мець асобныя прафсаюзныя камітэты для абслугоўвання выключна рабочых прыватных прадпрыемстваў, была падтрыманая Прэзідыумам ЦСПСБ. Апошні заначыў, што мясцкамы павінны аб'ядноўваць толькі прыватныя прадпрыемствы, дапускаючы ў асобных выпадках абслугоўванне імі працкалектываў, але ні ў якім разе дзяржаўных прадпрыемстваў і устаноў[18].

Прафсаюзныя органы БССР праводзілі агульныя сходы і канферэнцыі працоўных прыватнага сектара. Так, Прэзідыум ЦСПСБ склікаў 27 верасня 1925 г. у Мінску канферэнцыю рабочых прыватных прад-



Рэпазіторый БНТУ

прыемстваў. Выбары дэлегатаў на яе (адзін ад 5 рабочых) праводзіліся па прафсаюзах на агульных сходах рабочых прыватных прадпрыемстваў. Канферэнцыя вызначыла шляхі ўдасканальвання прафсаюзнай работы ў прыватным сектары[19].

**Ахоп прафсаюзным членствам працоўных прыватных прадпрыемстваў і ўстаноў.** У першыя гады нэпа назіраліся складанасці з далучэннем рабочых да прафсаюзаў, галоўным чынам з-за боязі пераследу з боку ўладальнікаў прадпрыемстваў, пагрозы звальнення ва ўмовах беспрацоўя. Колькасць членаў прафсаюзаў, занятых на 1 жніўня 1923 г. на прыватных прадпрыемствах БССР, складала 2728 чалавек, або ўсяго 5,6% ад агульнай колькасці членаў саюзаў рэспублікі[20]. Яны працавалі на 1061 прыватным прадпрыемстве. Такім чынам, на адно прадпрыемства прыходзілася два-тры члены прафсаюза. Пры гэтым па прафсаюзе дрэваапрацоўшчыкаў на адным прадпрыемстве ў сярэднім працавала 9 членаў саюза, прафсаюзе друкароў — 8 членаў, прафсаюзе гарбароў — 3-4 члены саюза *(гл. табліцу 1)*. У прафсаюзах жа папяровай прамысловасці, будаўнічых рабочых, транспартных рабочых, чыгуначнікаў, воднікаў, працаўнікоў народнай сувязі, асветы абслугоўваемых прыватных прадпрыемстваў і ўстаноў не было зусім.

Большасць (51%) усіх членаў прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах прыходзілася на г. Мінск, 23,1% — на Бабруйскі павет і г. д. *(гл. табліцу 2)*.

Аднак члены прафсаюзаў у гэты час меліся толькі менш чым на трэці (31,6%) прыватных прадпрыемстваў БССР. Усяго ў 1923 г. у рэспубліцы налічвалася 3212 прыватныя прадпрыемствы[21]. Гэта былі пераважна дробныя і саматужныя прадпрыемствы гарбарнай, швейнай, харчовай, металаапрацоўчай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, на якіх працавалі ў сярэднім 2-3 наёмных рабочых.

У наступныя гады колькасць членаў галіновых саюзаў у прыватным сектары стала павялічвацца. Калі ў кастрычніку 1924 г. на прыватных прадпрыемствах БССР працавалі 5749 чалавек, альбо 5,1% працуючых членаў прафсаюзаў, то ў кастрычніку 1925 г. — 7417 чалавек (больш за 5,5% працуючых членаў прафсаюзаў)[22]. Найбольшая ўдзельная вага рабочых прыватных прадпрыемстваў сярод членаў саюза — 35,1% — была ў прафсаюзе гарбароў. У верасні 1925 г. на 909 прыватных гарбарных прадпрыемствах працавалі 1636 рабочых[23]. Гэтыя даныя адпавядалі і сітуацыі па СССР. Калі на 1 красавіка 1925 г., паводле даных УЦСПС, на прыватных прадпрыемствах краіны налічвалася 198 919 членаў прафсаюзаў, то на 1 кастрычніка таго ж года — 236 162. Рабочыя прыватных прадпрыемстваў складалі 3,8% ад агульнай колькасці працуючых членаў прафсаюзаў. Ахоп членствам у прафсаюзах працуючых у прыватнай прамысловасці СССР на пачатак 1925 г. дасягнуў 85%[24]. У БССР у прафсаюзныя шэрагі былі ўключаны 83% рабочых і служачых прыватных прадпрыемстваў[25].

Аднак большасць рабочых прыватных прадпрыемстваў адносілася да членства ў прафсаюзе фармальна. Прафсаюзны білет часта разглядаўся толькі як рэкамендацыя пры паступленні на працу. Тыпавое тарыфнае пагадненне з уладальнікамі прыватных прадпрыемстваў прадугледжвала прыярытэт членаў прафсаюза пры прыёме на працу, і галіновыя саюзы пакідалі за сабой права здымаць з працы не членаў саюза і замяняць іх сваімі членамі.

Больш за тое, у 1926 г. намецілася тэндэнцыя змяншэння колькасці членаў прафсаюзаў у прыватным сектары. На 1 кастрычніка іх лічба ў БССР склала 6367 чалавек. Доля рабочых прыватных прадпрыемстваў сярод усіх працуючых членаў прафсаюзаў рэспублікі зменшылася з 5,5% да 4%[26]. Калі на 1 кастрычніка 1925 г. на прыватных прадпрыемст-

*Табліца 1*

**Колькасць членаў галіновых прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах Беларусі на 1 жніўня 1923 г.**

| № | Назва прафсаюза | Колькасць прадпрыемстваў | Занята членаў саюзаў |
|---|---|---|---|
| 1. | Дрэваапрацоўшчыкаў | 19 | 177 |
| 2. | Швейнай прамысловасці | 176 | 465 |
| 3. | Гарбароў | 222 | 678 |
| 4. | Харчасмакавай прамысловасці | 114 | 414 |
| 5. | Металістаў | 72 | 183 |
| 6. | Хімікаў | 25 | 56 |
| 7. | Друкароў | 11 | 88 |
| 8. | Народнага харчавання | 42 | 92 |
| 9. | Працаўнікоў камунальнай гаспадаркі | 222 | 284 |
| 10. | Працаўнікоў зямлі і лесу | 104 | 191 |
| 11. | Медсанпрацы | 6 | 11 |
| 12. | Працаўнікоў мастацтва | 4 | 16 |
| 13. | Савецкіх працаўнікоў | 44 | 73 |
| **Усяго** | | **1061** | **2728** |

Рэпазіторый БНТУ

*Табліца 2*

**Колькасць членаў прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах рэгіёнаў БССР на 1 жніўня 1923 г.**

| № | Рэгіён | Колькасць прадпрыемстваў | Занята членаў саюзаў |
|---|---|---|---|
| 1 | г. Мінск | 637 | 1391 |
| 2 | Мінскі павет | 17 | 50 |
| 3 | Бабруйскі павет | 252 | 631 |
| 4 | Барысаўскі павет | 21 | 137 |
| 5 | Ігуменскі павет | 16 | 201 |
| 6 | Мазырскі павет | 54 | 172 |
| 7 | Слуцкі павет | 64 | 146 |
| **Усяго** | | **1061** | **2728** |

*Крыніца: НА РБ. Ф. 265, воп.1, спр. 1365, арк. 24.*

вах з пяццю і болей рабочымі налічвалася 7113 чалавекі (7,3% ад агульнай колькасці працуючых членаў саюзаў), то на 1 кастрычніка 1926 г. — 5244 чалавекі (4,8%), на 1 красавіка 1927 г. — 6050 чалавек (4,5%)[27]. Тлумачылася гэта змяншэннем колькасці адносна буйных прыватных прадпрыемстваў і павелічэннем колькасці саматужнікаў без наёмных рабочых, але з вучнямі (у гэтым выпадку прадпрымальнікам прадастаўляліся падатковыя ільготы). З улікам жа так званых "адзіночак", якія не ўвайшлі ў вышэйпазначаныя лічбы, наёмныя рабочыя прыватнага сектара складалі на 1 кастрычніка 1926 г. 10,1%, а на 1 кастрычніка 1927 г. — 7,2% (9711 з 133 795 чал.) працуючых членаў прафсаюзаў БССР[28].

**Накірункі работы прафсаюзаў у прыватным сектары.** Асноўным накірункам дзейнасці прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах было ***заключэнне калектыўных дагавораў з наймальнікамі***. Адзін з першых у БССР калектыўных дагавораў быў заключаны 8 снежня 1921 г. паміж прафсаюзам харчасмакавай прамысловасці і прыватным прадпрымальнікам, уладальнікам патачна-крахмальнага завода ў Мінску Марголіным. Складаўся гэты дагавор з 7 пунктаў і прадугледжваў устанаўленне памеру аплаты працы — 8 тыс. руб. за 1 пуд пры церцы бульбы, або 30 тыс. руб. за 8-гадзінны працоўны дзень (для падлеткаў — 25 тыс. руб. за 6-гадзінны дзень). Звальненне і прыём на работу праводзіліся толькі з ведама галіновага саюза ці ўпраўлення ўліку рабочай сілы Наркамата працы. Пры ліквідацыі прадпрыемства пастаянным рабочым, якія адпрацавалі не менш за тры месяцы, выплачваліся "ліквідацыйныя" грошы за два тыдні. Рабочыя абавязваліся добрасумленна ставіцца да працы, а прадпрымальнік — выконваць усе правілы па ахове працы[29].

13 студзеня 1922 г. адбылася нарада па пытаннях працы на прыватных прадпрыемствах, скліканая аб'яднаным аддзелам эканомікі і нарміравання працы (ЭКАНП) Саўпрафбела. Па першым пытанні "Аб калектыўных дагаворах з прыватнымі прадпрыемствамі" было прынята рашэнне пачаць паступовы пераход да заключэння дагавораў з прадпрыемствамі. На наступнай нарадзе, якая адбылася праз тыдзень, было вырашана *"захаваць без змянення ў аснове прыкладны калектыўны дагавор, з якога самі саюзы, у адпаведнасці з умовамі працы, могуць выключыць ці дапоўніць які-небудзь пункт, але сутнасць прыкладнага дагавора павінна застацца"*[30]. Усе калектыўныя дагаворы павінны былі рэгістравацца ў ЭКАНПе Саўпрафбела.

Наймальнікі ў пераважнай большасці не хацелі заключаць калектыўныя дагаворы, але дзякуючы настойлівасці прафсаюзаў на 1 красавіка 1923 г. на прыватных прадпрыемствах БССР былі заключаны 750 калектыўных дагавораў і тарыфных пагадненняў, якія ахоплівалі 2370 работнікаў[31]. Акрамя таго, у шэрагу прафсаюзаў (працаўнікоў народнага харчавання, камунальнай гаспадаркі) пачалася кампанія па заключэнні тарыфных пагадненняў з наймальнікамі рабочых-адзіночак. Як правіла, яны папярэдне абмяркоўваліся на агульных сходах рабочых, большасць з іх заключалася пад кантролем вышэйстаячых прафсаюзных органаў. Пры заключэнні калектыўных дагавораў на прыватных прадпрыемствах прафсаюзы дамагліся больш значных, чым на дзяржаўных прадпрыемствах, працэнтных адлічэнняў на культурныя патрэбы, утрыманне прафсаюзных камітэтаў. Апошнія ўтрымліваліся за кошт 2% налічэнняў на зарплату, якая выплачвалася прадпрымальнікамі.

***Палітыка заработнай платы ў прыватным сектары***, якая праводзілася прафсаюзамі, была накіраваная на абарону інтарэсаў рабочых. На з'ездах пастаянна адзначалася, што зарплата на прыватным прадпрыемстве павінна быць не ніжэй, чым на аналагічным дзяржаўным прадпрыемстве. Гэта было рэалізавана на практыцы. На прыватных прадпрыемствах больш шырокае распаўсюджанне атрымала здзельная аплата, якая павышала зацікаўленасць чалавека ў выніках працы. Прафсаюзы сачылі за своечасовай выплатай зарплаты. У выпадку яе затрымкі калектыўныя дагаворы прадугледжвалі выплату наймальнікам пені. Прычым калі на дзяржаўных прадпрыемствах зарплату часам затрымлівалі на месяц і болей, то ў адносінах прыватніка судовае праследаванне нярэдка ініцыявалася прафсаюзам за спазненне ў выдачы заробку рабочым усяго на некалькі дзён.



Рэпазіторый БНТУ

У ходзе прафсаюзнага абследавання ў 1925 г. было ўстаноўлена, што ўсе рабочыя прыватных прадпрыемстваў ахопленыя калектыўнымі дагаворамі. Заработная плата складала ад 35 да 74 чырвоных руб.[32] (пераход на чырвоныя рублі адбыўся па грашовай рэформе ў 1923—1924 гг.). Пры гэтым рабочыя некаторых прыватных прадпрыемстваў атрымлівалі большую зарплату, чым рабочыя на аналагічных дзяржаўных прадпрыемствах, што суправаджалася большай інтэнсіфікацыяй іх працы. Акрамя таго, яны не мелі іншых ільгот: вельмі мала хто з іх быў у дамах адпачынку, у іх былі горшыя жыллёвыя ўмовы і г. д.[33].

Асаблівую ўвагу прафсаюзныя органы надавалі ахове працы на прыватных прадпрыемствах. У першыя гады нэпа санітарна-тэхнічны стан прыватных прадпрыемстваў быў вельмі дрэнным з-за недахопу сродкаў на добраўпарадкаванне. Сумесна з інспекцыяй працы Наркамата працы і эканамічнай інспекцыяй Наркамата рабоча-сялянскай інспекцыі прафсаюзы праводзілі абследаванне ўмоў працы рабочых. Так, з мая 1922 г. да студзеня 1923 г. было абследавана 1547 прыватных прадпрыемстваў, выяўлены антысанітарныя ўмовы працы, адсутнасць спецвопраткі, грубыя парушэнні заканадаўства па ахове працы: звышнарматыўная працягласць працоўнага дня, ухіленне ад выплаты страхавых узносаў. Як вынік, 184 прадпрымальнікі былі прыцягнутыя да судовай адказнасці і аштрафаваныя за парушэнне працоўнага заканадаўства[34]. Аднак у ходзе абследавання прыватных прадпрыемстваў, праведзенага прафсаюзамі ў 1925 г., выявілася, што санітарныя ўмовы працы заставаліся кепскімі, прыватныя прадпрыемствы былі абсталяваныя самым прымітыўным спосабам, у многіх не хапала святла, было брудна, душна. Камісіі па ахове працы пры мясцкамах саюзаў былі бяссільныя чагосьці дамагчыся ад наймальнікаў, паколькі прадпрыемствы знаходзіліся ў цяжкім фінансавым становішчы[35].

Таксама прафсаюзы вялі барацьбу з парушэннем працоўнага заканадаўства, у прыватнасці з хітрыкамі з боку прыватных прадпрымальнікаў пры прыёме на працу часовых рабочых. Гэтая з'ява, што павялічвала беспрацоўе сярод членаў саюза, была асабліва распаўсюджаная на гарбарных прадпрыемствах — аплата працы такіх рабочых была значна ніжэй існуючых ставак саюза, ім не прадастаўляліся водпускі, не выплачвалася дапамога пры звальненні. За часовых рабочых, якіх наймалі не з членаў прафсаюза, прадпрымальнікі не выплачвалі страхавыя ўзносы і адлічэнні ў мясцкам, не неслі ніякіх падатковых абавязацельстваў[36].

Прадпрымальнікі выкарыстоўвалі розныя спосабы абысці заканадаўства і прафсаюзны кантроль: сістэму раздачы працы на дом, фіктыўныя прамысловыя, працоўныя і інвалідныя арцелі, штучнае пераўтварэнне наёмных рабочых у самастойных вытворцаў-саматужнікаў і г. д. Прафсаюзы вялі з гэтым рашучую барацьбу. Напрыклад, агульны сход рабочых прыватных гарбарных прадпрыемстваў Мінска пастанавіў уключыць у калектыўны дагавор палажэнні аб забароне прадпрымальнікам раздаваць працу на дом, неабходнасці сацыяльнага страхавання рабочых-кватэрнікаў (надомнікаў). Дзякуючы ўнясенню гэтых пунктаў у пагадненне з прыватнымі прадпрымальнікамі і пільнаму кантролю з боку саюза за іх выкананнем, ужо да пачатку 1923 г. выдача працы на дом была амаль зліквідаваная. Падобную работу праводзілі і іншыя прафсаюзы. Так, саюз швейнікаў выяўляў кватэрнікаў і прымацоўваў іх да майстэрняў. Прафсаюз будаўнічых рабочых, нягледзячы на супрацьдзеянне Белсельпрамсаюза, дамогся ліквідацыі фіктыўнай працоўнай арцелі, створанай былымі падрадчыкамі. Цэнтральнае праўленне саюза харчавікоў Беларусі ў спецыяльным цыркулярным лісце звярнула ўвагу на "засмечванне" інваліднай кааперацыі прыватным капіталам і ўтоеную пад яе шыльдай эксплуатацыю працы[37].

Таксама прафсаюзы выступалі з заканадаўчымі ініцыятывамі ў справе рэгулявання працы рабочых на прыватных прадпрыемствах. Так, Цэнтральны камітэт саюза гарбароў падрыхтаваў праект дэкрэта аб кватэрніках. Пасля прапрацоўкі на шэрагу нарад пры тарыфна-эканамічным аддзеле УЦСПС з удзелам зацікаўленых саюзаў ён быў ухвалены Прэзідыумам УЦСПС і затым зацверджаны 2 ліпеня 1923 г. Саветам Народных Камісараў. Дэкрэт увёў кантроль працоўнага дня пры сістэме працы на даму, што дало магчымасць прафсаюзам і інспекцыі працы вытрымліваць 8-гадзінны рабочы дзень для кватэрнікаў. Забаранялася выдаваць працу на дом асобам, занятым па найме на прадпрыемствах і ўстановах поўны рабочы дзень, а таксама ў большым аб'ёме, чым можна было зрабіць на працягу працоўнага дня. Згодна з дэкрэтам, зарплата рабочых-кватэрнікаў устанаўлівалася калектыўнымі і працоўнымі дагаворамі[38].

Прафсаюзныя органы кантралявалі ўмовы прыёму і звальнення работнікаў прыватных прадпрыемстваў. Таму на прыватных прадпрыемствах, напрыклад, гарбарнай прамысловасці БССР у 1928 г. не з'яўляліся членамі прафсаюза толькі 2,1% працуючых, тады як на дзяржаўных прадпрыемствах галіны — 4,9%[39]. У Мінску даволі актыўна дзейнічаў групкам прыватных гарбарных прадпрыемстваў, які дамагаўся заключэння калектыўных дагавораў, аднаўлення на працы звольненых рабочых[40].

**Узаемаадносіны паміж прафсаюзамі і прадпрымальнікамі.** У адрозненне ад дзяржаўных прадпрыемстваў, дзе прафсаюзы вялі актыўную эканамічную работу і сама адміністрацыя ўваходзіла ў склад саюза, у прыватным сектары задачы саюзаў заключаліся ў асноўным у абароне правоў працоўных. Адносіны прадпрымальнікаў з прафсаюзнымі органамі складваліся на аснове калектыўных дагавораў і ў большасці выпадкаў былі нармальныя. Наймальнікі проста баяліся даводзіць справу да канфлікту. І ўсё ж канфлікты паміж рабочымі і наймальнікамі адбываліся на глебе невыканання калектыўнага дагавора, прыёму і звальнення рабочых і г. д. Вырашаліся яны, як правіла, у канфліктных органах, прычым на карысць рабочых. Там, дзе не была створана расцэначна-канфліктная камісія (РКК), разбор канфліктаў праводзіўся мясцкамам саюза[41]. Заўважым, што

Репозиторий БНТУ

большасць партыйных і прафсаюзных кіраўнікоў прытрымліваліся меркавання, што прыватныя прадпрыемствы — гэта "поле бітвы" пралетарыяту і прадпрымальнікаў. Класавую накіраванасць работы прафсаюзаў дэманстравалі і рашэнні прафсаюзных органаў. Так, на Прэзідыуме Цэнтральнага праўлення саюза гарбароў у лістападзе 1926 г. крытыкавалася пазіцыя полацкага акруговага аддзялення, якое правяло сумесны вечар вучняў з саматужнікамі, дзе апошнім былі ўручаныя адрасы з падзякай за добрае навучанне вучняў з ліку моладзі. Кіраўнік ЦП прафсаюза пры гэтым заўважыў, што *"мы можем себе представить, какое содружество классов мы имеем в Полоцке, какое классовое воспитание получают наши ученики, работающие у кустарей"*[42].

***Арганізацыя прафсаюзамі забастовак на прыватных і арэндных прадпрыемствах.*** Дзейнасць прафсаюзаў, накіраваная на заключэнне паміж уладальнікамі прадпрыемстваў і працоўнымі калектыўных дагавораў і на ажыццяўленне кантролю за іх выкананнем, дазваляла ахоўваць рабочых ад самавольства прадпрымальнікаў. Разам з тым для ліквідацыі недахопаў у становішчы рабочых, а таксама як сродак ціску на прадпрымальнікаў пры заключэнні калектыўных дагавораў прафсаюзы актыўна выкарыстоўвалі забастоўкі. Так, у 1926/27 г. многія ўладальнікі прыватных гарбарных прадпрыемстваў вырашылі не заключаць новыя калектыўныя дагаворы і пагражалі ліквідаваць свае прадпрыемствы, што пазбавіла б рабочых сродкаў да існавання. Галіновы прафсаюз, абараняючы інтарэсы рабочых, арганізаваў забастоўку. У выніку прыватнікі былі вымушаныя адмовіцца ад сваіх планаў[43]. Такія меры прафсаюзы прадпрымалі не раз. Толькі з 1 студзеня 1926 г. па 1 чэрвеня 1927 г. імі была арганізаваная 21 забастоўка на прыватных прадпрыемствах БССР[44].

Найбольшы рэзананс атрымалі забастоўкі ў маі і кастрычніку 1926 г. на гарбарным заводзе ў Магілёве, які знаходзіўся ў арэндзе прадпрымальніка Фраймана. У 1925 г. на прадпрыемстве было занята 138 наёмных работнікаў. У наступным годзе, калі ўмовы вядзення бізнесу пагоршыліся, наймальнікам было заяўлена аб намеры звольніць палову рабочых. Прафсаюз паспрабаваў уладкаваць пытанне, але не знайшоў кампрамісу з боку наймальніка і ўрэшце вымушаны быў аб'явіць забастоўку. Гарбароў падтрымалі рабочыя піваварнага завода (дзе працавала 60 чалавек), які належаў таму ж прадпрымальніку. Пасля цяжкіх перамоў вечарам 19 мая 1926 г. удалося падпісаць калектыўны дагавор на ўмовах прафсаюза, і рабочыя ўзяліся за працу[45]. Аднак у кастрычніку 1926 г. на гэтым заводзе зноў адбылася забастоўка, якая набыла яшчэ больш востры і настойлівы характар. Яе прычынай стаў намер скараціць палову са 108 рабочых, а потым увогуле закрыць прадпрыемства. Забастоўка доўжылася 17 дзён. Прадпрымальнікаў байкатавалі ўсе рабочыя і служачыя Магілёва. У выніку наймальнікаў абавязалі выплаціць рабочым грошы за тры месяцы, арэндны дагавор быў скасаваны і завод перададзены Белтрэсту[46].

Не трэба, аднак, пераацэньваць значэнне забастовак на прыватных прадпрыемствах. Да таго ж патрабаванні, якія прад'яўлялі прафсаюзы прадпрымальнікам, часам былі заведама нерэальныя. Часцей за ўсё акцыі прафсаюзаў выкарыстоўваліся як сродак класавага выхавання рабочых прыватнай прамысловасці, былі накіраваныя на выкананне прадпісанняў партыйных органаў аб паступовым выцясненні прыватнага капіталу з эканомікі.

Разам з тым мелі месца выпадкі, калі прафсаюзныя органы лічылі немэтазгодным праводзіць забастоўкі на прыватных прадпрыемствах. Так, 24 жніўня 1927 г. Прэзідыум Цэнтральнага праўлення прафсаюза гарбароў Беларусі аб'явіў Полацкаму акруговаму аддзяленню строгую вымову з папярэджаннем за арганізацыю забастоўкі на прыватным прадпрыемстве Маркмана ў мястэчку Ула без санкцыі ЦП і папярэдзіў усе акруговыя аддзяленні, што забастоўкі ні ў якім разе не могуць быць аб'яўленыя без папярэдняй санкцыі ЦП[47]. Калі Віцебскае акруговае аддзяленне саюза 14 студзеня 1928 г. звярнулася за дазволам на забастоўку на прыватным прадпрыемстве ў Гарадку, Прэзідыум ЦП прафсаюза ў санкцыі забастоўкі адмовіў і прапанаваў прыняць усе меры для мірнага вырашэння канфлікту[48].

**Ацэнка агульнага стану прафсаюзнай работы на прыватных прадпрыемствах.** У матэрыялах прафсаюзных абследаванняў адзначалася, што праца саюзаў на прыватных прадпрыемствах "адчувалася", але толькі сярод рабочых — членаў саюзаў. Не члены саюза грамадскім жыццём не цікавіліся і "блізка стаялі да гаспадара". У цэлым рабочыя ў прыватным сектары былі не такія палітычна развітыя і актыўныя, як на дзяржаўных прадпрыемствах[49]. Прэзідыум ЦСПСБ 5 кастрычніка 1927 г. спецыяльна разгледзеў пытанне "Аб становішчы прафсаюзнай працы ў прыватных прадпрыемствах". У пастанове было адзначана, што саюзныя арганізацыі маюць асобныя дасягненні ў абслугоўванні рабочых прыватнага сектара: агульнае ўмацаванне прафсаюзнай работы на прыватных прадпрыемствах, павышэнне аўтарытэту нізавых ячэек сярод рабочых, абарона эканамічных інтарэсаў рабочых і паднясце свядомасці апошніх. У той жа час не былі выкананыя дырэктывы па арганізацыі мясцкамаў выключна для рабочых прыватных прадпрыемстваў, у некаторых групкамах адсутнічалі расцэначна-канфліктныя камісіі, нерэгулярна скліkаліся агульныя сходы рабочых, слаба была арганізаваная праверка выканання рашэнняў. Прэзідыум ЦСПСБ канстатаваў існаванне асобных груп рабочых, якія знаходзіліся пад уплывам прыватных прадпрымальнікаў. Саюзам было ўказана не аслабляць распачатую працу па паднясці класавай свядомасці рабочых, вывучаць метады ўздзеяння на апошніх з боку прадпрымальнікаў, дамагацца поўнага падпарадкавання ўплыву прафсаюза ўсіх груп рабочых. Прафсаюзны орган прапанаваў рэарганізаваць аб'яднаныя камітэты прыватных, кааператыўных і дзяржаўных прадпрыемстваў у самастойныя групкамы прыватных прадпрыемстваў; арганізаваць

Репозиторий БНТУ

інстытут дэлегацкіх сходаў пры групкамах і РКК. Саюзным арганізацыям было прапанавана заняцца вывучэннем руху зарплаты і эканамічнага стану прадпрыемстваў на прадмет лепшага падыходу пры заключэнні дагавораў. Прэзідыум ЦСПСБ даручыў тарыфна-эканамічнаму аддзелу прапрацаваць разам з зацікаўленымі саюзамі пытанне аб метадах барацьбы з прадпрымальнікамі прыватных прадпрыемстваў, а саюзам у сваёй працы ўзмацніць уплыў на рабочых прыватных прадпрыемстваў — надомнікаў, а таксама павесці рашучую барацьбу з членамі саюзаў, якія працавалі падпольна[50].

**Праблемы і супярэчнасці ў прафсаюзнай рабоце на прыватных прадпрыемствах.** У дакладах прафсаюзных органаў адзначалася, што класавае выхаванне на прыватных прадпрыемствах праходзіла складана, паколькі большасць рабочых лёгка паддавалася "нэпманскаму ўплыву", бо атрымлівала больш высокую зарплату, чым рабочыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Здараліся нават выпадкі, калі рабочыя прама ці ўскосна садзейнічалі наймальнікам у імкненні пазбавіцца ад падаткаў[51]. Такія адносіны рабочых да прадпрымальнікаў прафсаюзы і партыйныя органы тлумачылі палітычнай адсталасцю і неадукаванасцю людзей. Некаторыя прадпрымальнікі спрабавалі ўстанавіць з рабочымі патэрналісцкія або партнёрскія адносіны.

Пры гэтым, аднак, рабочыя прыватных прадпрыемстваў фактычна былі пазбаўленыя магчымасці ўдзельнічаць у вырашэнні вытворчых пытанняў. На абсалютнай большасці прыватных прадпрыемстваў не былі створаны вытворчыя нарады, хоць пытанне аб іх арганізацыі актыўна абмяркоўвалася ў друку. Прыхільнікі стварэння вытворчых нарад заяўлялі, што рабочыя праз іх змогуць уплываць на працэс вытворчасці; праціўнікі ж лічылі, што можа ўзнікнуць наступная парадаксальная сітуацыя: *"партийные и профессиональные организации устраивают производственные совещания с целью улучшения производства, т. е. в конечном итоге, с целью сберечь и положить лишний червонец в карман частного хозяйчика"*[52].

Пошуку прафсаюзамі свайго месца на недзяржаўных прадпрыемствах перашкаджала не толькі дваістасць становішча прыватнай прамысловасці, але і пастаянны ціск з боку партыйных органаў. Прафсаюзы спрабавалі прысвоіць функцыі адміністрацыі, вылучалі патрабаванні, не прадугледжаныя калектыўнымі дагаворамі, акцэнтавалі класавую накіраванасць у сваёй дзейнасці.

**Прафсаюзная работа ва ўмовах згортвання нэпа.** У канцы 1920-х гг. колькасць прыватных прадпрыемстваў пачала рэзка змяншацца. Напрыклад, па 8 прафсаюзах вытворчых галін на прыватных прадпрыемствах БССР на 1 красавіка 1928 г. было 3327 рабочых, а на 1 красавіка 1929 г. — толькі 1378 рабочых. Па групе прафсаюзаў невытворчых галін (народнага харчавання, камунальнай гаспадаркі, транспартных рабочых, медсанпрацы) рабочых і служачых, занятых на прыватных прадпрыемствах, было на 1 красавіка 1928 г. 3932 чалавекі, а праз год — 3008 чалавек. Змяншэнне ўдзельнай вагі прыватных прадпрыемстваў і рабочых на іх адбывалася галоўным чынам за кошт ліквідацыі даволі буйных прыватных прадпрыемстваў або скарачэння рабочых на іх. Так, па саюзе металістаў койданаўская фабрыка "Слон" па вырабе ложкаў з 52 рабочымі стала кааператыўным прадпрыемствам; па саюзе дрэваапрацоўшчыкаў была закрыта грабёначная фабрыка (8 рабочых), перададзены трэсту Лесбел лесазавод з колькасцю 14 рабочых. Па саюзе друкароў колькасць рабочых каробачнай фабрыкі скарочана з 35 да 5 чалавек. Найбольш буйным з прыватных і арандаваных прадпрыемстваў БССР у 1929 г. з'яўлялася ігольная фабрыка ў Віцебску, дзе працавалі 48 рабочых[53].

Ва ўмовах росту беспрацоўя скарачэнне занятасці ў прыватным сектары эканомікі мела адмоўныя наступствы і не магло застацца без увагі прафсаюзных органаў. Прэзідыум ЦСПСБ 25 красавіка 1929 г. разгледзеў пытанне "Аб рабоце сярод рабочых прыватных прадпрыемстваў". Было адзначана, што за мінулы год па Менскай акрузе колькасць прыватных прадпрыемстваў значна зменшылася (з 324 да 232), у сувязі з чым паменшылася і колькасць працуючых на іх — з 776 да 299 чалавек. Змяншэнне ішло за кошт развіцця саматужнай прамысловасці, а таксама пашырэння дзяржаўнай і мясцовай прамысловасці. Улічваючы наяўнасць у прыватнай прамысловасці значнай колькасці вучняў, прафсаюзны орган падкрэсліў неабходнасць выканання існуючага заканадаўства аб вучнёўстве ў саматужнай прамысловасці, патрабаваў дамагацца рашучага пералому ў аплаце працы падлеткаў. Але пры гэтым асаблівая ўвага звярталася на неабходнасць весці актыўную барацьбу з уплывам прадпрымальнікаў і саматужнікаў на рабочую масу, растлумачваць сутнасць класавых супярэчнасцяў паміж прадпрымальнікамі і працоўнымі. Інспекцыя працы павінна была праводзіць абследаванні ўмоў працы рабочых прыватных прадпрыемстваў, весці рашучую барацьбу з прыхаваным прымяненнем рабочай сілы, дамагацца поўнага выканання прыватнікамі заканадаўства аб матэрыяльных і бытавых умовах працуючых[54].

У адносінах рэгулявання зарплаты і ўмоў працы прафсаюзамі праводзілася ранейшая лінія на павышэнне аплаты працы рабочых прыватных прадпрыемстваў. Апошнія былі ахопленыя калектыўнымі і працоўнымі дагаворамі. У цэлым заработная плата на прыватных прадпрыемствах была вышэй, чым на дзяржаўных. Па саюзе металістаў на прыватных прадпрыемствах сярэдняя зарплата дарослага рабочага складала ў 1928/29 г. 127 руб. на месяц, зарплата вучняў — 30 руб., па саюзе дрэваапрацоўшчыкаў — адпаведна 105 руб. і 27 руб. Але па саюзе швейнай прамысловасці сярэдняя зарплата дарослага рабочага складала 92 руб. 56 кап. (а фактычна па прычыне няпоўнага рабочага дня — 80 руб. 11 кап.), у той час як на дзяржаўным прадпрыемстве "Міншвяя" яна дасягнула 101 руб. 28 кап. Гэта значыць, зарплата на прыватных швейных прадпрыемствах была на 9% ніжэй,

чым на дзяржаўным, што не лічылася нармальным. З аховай працы справа у цэлым выправілася: прафсаюзныя камісіі па ахове працы праводзілі абследаванні прыватных прадпрыемстваў; па іх звестках, спецвопратка, мыла, рушнікі выдаваліся своечасова; рабочым прадастаўляўся адпачынак[55].

*Высновa*. Такім чынам, ва ўмовах стварэння ў перыяд нэпа прыватных прадпрыемстваў прафсаюзы БССР актывізавалі сваю работу сярод іх працоўных. Спецыфіка арганізацыйных форм прафсаюзнай працы на прыватных прадпрыемствах абумоўлівалася дробнымі памерамі і тэрытарыяльнай раскіданасцю гэтых прадпрыемстваў. Выбіраліся групавыя камітэты, прафупаўнаважаныя, камслужы, у некаторых прафсаюзах ствараліся райкамы і раймясцкамы для абслугоўвання працоўных недзяржаўнага сектара эканомікі. Пры гэтым прафсаюзы даволі эфектыўна адстойвалі інтарэсы наёмных рабочых і служачых: патрабавалі заключэння і сачылі за выкананнем калектыўных дагавораў і тарыфных пагадненняў, дабіваліся своечасовай і па магчымасці большай, чым у дзяржаўным сектары, аплаты працы, праводзілі абследаванні, кантралявалі ўмовы працы і быту наёмных працаўнікоў.

У той жа час роля прафсаюзаў у прыватным сектары эканомікі Беларусі ва ўмовах нэпа была супярэчлівай. З аднаго боку, яны прызнавалі неабходнасць існавання прыватных прадпрыемстваў для аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі; з іншага — часта бачылі ў прыватніках толькі эксплуататараў. У аснове дзейнасці прафсаюзаў ляжалі класавыя прынцыпы, а формы і метады іх работы ў многім вызначаліся тым, што яны былі прыдаткам партыйна-дзяржаўнага апарату. У другой палове 1920-х гг., калі адбывалася згортванне нэпа, колькасць прыватных прадпрыемстваў і працуючых на іх членаў прафсаюзаў пачала хутка памяншацца. У гэты час галоўная ўвага прафсаюзнымі органамі звярталася на неабходнасць вядзення актыўнай барацьбы з уплывам прадпрымальнікаў і саматужнікаў на рабочую масу, на выкананне партыйных дырэктыў аб паступовым выцясненні прыватнага капіталу з эканомікі.

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 3. Мн., 1973. С. 226-227.

[2] Советская Белоруссия. Мн., 1921. С. 151.

[3] Собрание узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского Правительства РСФСР. 1921, № 53. Ст. 323.

[4] Трифонов И.А. Классы и классовая борьба в СССР в начале нэпа (1921—1925 гг.). Л., 1969. С.124.

[5] Материалы по регулированию труда в частных предприятиях. М., 1921.С. 24—26.

[6] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК (1898—1971). Т.2. М.,1983. С. 471.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 265, воп.1, спр. 404, арк.15.

[8] Неманский И. Рабочее страхование в Белоруссии в 1922 г. (По материалам Всебелорусского Совещания Усобесов и Устрахотделов 27-28 ноября 1922 г.) // Народное хозяйство Белоруссии. 1923, № 2. С. 68-69.

[9] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 2064, арк.4.

[10] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 3. С. 248.

[11] Отчет о деятельности Президиума Совета профессиональных союзов Белоруссии (апрель 1922 г. — июнь 1923 г.). Мн., 1923. С.53—55.

[12] Отчет о деятельности Совета профсоюзов Белоруссии и Витебского губ. совета профсоюзов (за период июль 1923 г. по февраль 1924 г.). Мн., 1924. С. 20-21.

[13] НАРБ. Ф. 295, воп.1, спр. 3 , арк. 74-75.

[14] Там жа. Арк. 4-5.

[15] Там жа. Ф. 308, воп.1, спр.19, арк.112.

[16] Резолюции и постановления IV Всебелорусского съезда профсоюзов. Мн., 1924. С.9.

[17] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 1868, арк. 49-50.

[18] Там жа. Ф. 276, воп.1, спр. 98, арк. 60; ф. 265, воп.1, спр. 1869, арк. 391-392.

[19] Там жа. Ф. 265, воп.1, спр. 1869, арк. 247.

[20] Там жа. Спр. 1365, арк. 24.

[21] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т.3. Мн., 1973. С.247-248.

[22] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 1804, арк. 1-2.

[23] Там жа. Ф. 283, воп.1, спр. 74, арк. 11-12.

[24] Профсоюзы СССР. 1924—1926 гг.: Отчет ВЦСПС к VII съезду профсоюзов. М., 1926. С. 85, 87.

[25] Профессиональные союзы Белоруссии за 1924—1925 гг.: к V Всебелорусскому съезду профсоюзов. Мн., 1925. С.39-40.

[26] НАРБ. Ф.265, воп.1, спр. 1804, арк. 3.

[27] Отчет о работе Центрального совета профсоюзов Белоруссии за период декабрь 1925 г. — июнь 1927 г. К VI Всебелорусскому съезду профсоюзов. Мн., 1927. С. 85.

[28] Юдин Н. Наемный труд в частных предприятиях (По материалам ЦСПСБ) // Советское строительство.1928, № 1. С. 67.

[29] НАРБ. Ф.265, воп.1, спр. 479, арк. 24.

[30] Там жа. Спр. 405, арк. 4, 8.

[31] Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905—1969 гг.). Мн., 1970. С.121.

[32] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 1868, арк. 60.

[33] Там жа. Ф. 276, воп.1, спр. 98, арк. 391-392.

[34] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т.3. С. 250.

[35] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 2064, арк. 18.

[36] Там жа. Ф. 283, воп.1, спр. 76, арк. 28-31.

[37] Белкин Г. Рабочий вопрос в частной промышленности. М., 1926. С. 53, 57, 67, 68.

[38] Там жа. С.76—78.

[39] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 2648, арк. 230.

[40] Там жа. Ф. 283, воп.1, спр. 251, арк. 291.

[41] Там жа. Ф. 265, воп.1, спр. 2064, арк. 60; спр.1868, арк. 49-50.

[42] Там жа. Ф. 283, воп.1, спр. 76, арк. 391-392.

[43] Там жа. Ф. 265, воп.1, спр. 2211, арк. 4.

[44] Отчет о работе Центрального совета профсоюзов Белоруссии за период декабрь 1925 г. — июнь 1927 г. ... С.73.

[45] Эпштейн Б. Чем была вызвана забастовка на кожзаводе гр. Фраймана и К° в Могилеве // Прафесіянальны рух Беларусі. 1926, № 11. С. 10.

[46] НАРБ. Ф.283, воп.1, спр. 248, арк. 69—71.

[47] Там жа. Спр. 250, арк. 244.

[48] Там жа. Спр. 251, арк. 292.

[49] Там жа. Ф. 265, воп.1, спр. 2064, арк. 60.

[50] Там жа. Спр. 1870, арк. 221-222.

[51] Отчет Центрального совета профсоюзов Белоруссии за период декабрь 1925 г. — июнь 1927 г. ... С. 42-43.

[52] Никаноров А. О производственных совещаниях на частных предприятиях // Правда. 1924, 23 августа.

[53] НАРБ. Ф. 265, воп.1, спр. 2659, арк. 27.

[54] Там жа. Спр. 2436, арк. 333.

[55] Там жа. Спр. 2659, арк. 3-4.



Репозиторий БНТУ